# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

25 красавіка 2002 года, чацвер, № 9 (1857)


СВЯТЫ

## Вернасць традыцыям

Беларускі дзяржаўны універсітэт за 80 год свайго існавання назапасіў нямала слаўных баявых і працоўных традыцый. Непасрэдным захавальнікам лепшых традыцый, без якіх немагчыма ўявіць пераемнасць пакаленняў, з'яўляецца арганізацыя ветэранаў вайны і працы БДУ. Правафланговымі нашай арганізацыі па праве з'яўляюцца Героі Савецкага Саюза прафесар Дз.П. Жмуроўскі і дацэнт М.Я. Зайцаў.

На жаль, час няўмольны, і ўсё менш застаецца сярод нас удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Тым больш важна забяспечыць ім штодзённую ўвагу з боку кіраўніцтва, прафсаюзных і маладзёжных арганізацый як факультэтаў, так і агульнауніверсітэцкіх падраздзяленняў. Не менш важна эфектыўна выкарыстаць інтэлектуальны патэнцыял і жыццёвы вопыт ветэранаў у выхаванні змены. Разнастайныя аспекты гэтай праблемы абмяркоўваліся нядаўна на пашыраным пасяджэнні Савета ветэранаў БДУ, у якім прынялі ўдзел прарэктар БДУ Ул.В. Сувораў, дарадца рэктара БДПУ прафесар А.Т. Карaткевіч, прадстаўнікі іншых ВНУ сталіцы.

У маі мы рыхтуемся ўрачыста адзначыць Дзень Перамогі. Але, разам з тым, ужо зараз мы павінны весці падрыхтоўку да вялікага свята — 60-годдзя Вялікай Перамогі, якое адбудзецца ў 2005 годзе. Савет ветэранаў БДУ працягвае працу па зборы, апрацоўцы, удакладненні і абагульненні матэрыялаў для поўнай кнігі памяці «Белдзяржуніверсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны» (першы, скарочаны варыянт выдадзены ў 2002 годзе). Мы просім усіх ветэранаў, а таксама іх сваякоў перадаць у Савет ветэранаў (пакой 238 галоўнага корпуса БДУ) матэрыялы пра іх жыццё і дзейнасць аб'ёмам 1-3 старонкі альбо копіі дакументаў.

*І.П. ЗЯЦЬКОЎ, старшыня Савета ветэранаў*
*А.І. КОТАЎ, сакратар Савета ветэранаў*



*Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны ў студэнцкай аўдыторыі фізічнага факультэта*

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

## Моладзь пра Еўрапейскі Саюз

*У Цэнтры еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ адбудзецца ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на лепшую студэнцкую (аспіранцкую) работу на тэму «Еўрапейскі Саюз у ХХІ стагоддзі».*

Конкурс праводзіўся ў рамках праекту «Павышэнне магчымасцяў Цэнтра еўрапейскай дакументацыі — стварэнне сістэмы распаўсюджвання інфармацыі пра дзейнасць еўрапейскіх супольнасцяў і спрыяння еўрапейскім даследаванням», які ажыццяўляецца па праграме TACIS «Развіццё грамадзянскай супольнасці». Мэтай конкурсу было прыцягнуць увагу беларускай навучэнскай моладзі да еўрапейскай тэматыкі. Аргкамітэт адзначыў высокі ўзровень прадстаўленых прац і шырокую геаграфію ўдзельнікаў. Правядзенне наступнага конкурсу прызначана на сёлетнюю восень.

Пераможцамі гэтага конкурсу сталі:

1. Мікалай Лукша, студэнт магістратуры па міжнародных адносінах Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта («Еўрапейскае грамадзянства і працэс еўрапейскай інтэграцыі»);
2. Ірына Цыбульская, студэнтка Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута («Савет Еўропы +/− Беларусь?»);
3. Зінаіда Рацько, студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта («З Еўропай хочацца сябраваць»).

Усе яны будуць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі. Спецыяльным заахвочвальным прызам арганізатары адзначылі работу студэнта факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта Ігара Кольчанкі «Апошні выклік еўрапейскай інтэграцыі: трансфармацыя ў ваенна-палітычнай сферы».

*Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэл. 209-54-46, а таксама на вэбсайце Цэнтра еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ (http://www.ced.bsu.by).*

*Вольга ПАНКРАЦЕНКА*

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

## Адкрыты сайт кафедры

Нядаўна я даведалася пра адкрыццё ў Інтэрнэце сайта кафедры англійскай мовы і моўнай камунікацыі БДУ (www.english-speech.narod.ru).

Сама кафедра была адкрыта 20 снежня 1998 года. Яе выкладчыкі працуюць са студэнтамі факультэта журналістыкі, эканамічнага факультэта і ФФСН. Летась яна правяла Інтэрнэт-канферэнцыю, у якой узялі ўдзел студэнты нашага універсітэта (ФФСН і факультэт журналістыкі) і студэнты Заходне-Чэстэрскага універсітэта, якія навучаюцца па спецыяльнасці «інфармацыя і камунікацыя». За час існавання кафедры яе супрацоўнікі выпусцілі пяць дапаможнікаў.

Пазнаёміцца з гісторыяй кафедры і яе выкладчыкамі больш падрабязна можна на сайце. Таксама тут можна і падвучыцца: на сайце ёсць самыя сучасныя слоўнікі, мноства тэстаў, практыкаванняў і навучальных гульняў. Тыя, хто захоча адпачыць і пасмяяцца, змогуць зазірнуць на старонку англійскага гумару. І (на мой погляд — самае галоўнае) яшчэ тут можна падзяліцца сваімі думкамі, сумневамі, расчараваннямі, ідэямі. Усё гэта выглядае як запрашэнне да супрацоўніцтва, да дыялогу, дзякуючы якому адбываецца бесперапынны абмен інфармацыяй і досведам, нараджаюцца, абмяркоўваюцца і ажыццяўляюцца самыя неверагодныя праекты і ідэі.

*Арына ГАНЧАРОВА, студэнтка факультэта журналістыкі*

ПОСТФАКТУМ

## Шлях да ведаў – праз бібліятэку

Напрыканцы сакавіка адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця чытальнай залы на геаграфічным факультэце. Сімвалічна, што стужку, якая адчыняла дзверы, перарэзалі студэнты факультэта. Гэта было другое нараджэнне чытальнай залы: першае адбылося яшчэ ў лістападзе 1983 года.

З прывітальным словам да прысутных звярнуўся дэкан факультэта І.І. Пірожнік. Ён нагадаў усім, што шлях студэнтаў да ведаў ляжыць праз бібліятэку. Былы выпускнік геаграфічнага факультэта, а цяпер навуковец, намеснік дырэктара НДЭІ Міністэрства эканомікі Беларусі У.А. Багданаў пажадаў студэнтам плённай працы і выдатнай вучобы, а таксама падарыў кнігі. Намесніца дырэктара бібліятэкі БДУ А.В. Буціна падзякавала кіраўніцтву факультэта за намаганні па адкрыцці чытальнай залы.

*Па інфармацыі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ падрыхтавала Вольга ПАНКРАЦЕНКА*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Дзень выдатніка на геаграфічным факультэце

Астранамічны надыход вясны на геаграфічным факультэце быў адзначаны традыцыйным святам "Дзень выдатніка". На яго былі запрошаны студэнты, якія на працягу часу навучання дэманструюць трывалыя веды, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці факультэта і маюць сярэдні бал вышэй за 4,75, а таксама загадчыкі і вучонага савета факультэта.

Урачыстую частку адкрыў намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце М.В. Кухарчык, які сам быў выдатнікам у час навучання на геафаку і таму ведае, як гэта цяжка. А потым слова ўзяў дэкан факультэта, прафесар І.І. Пірожнік. "У імклівым бегу часу мы не заўсёды заўважаем, што свет вакол нас кардынальна змяняецца. Менавіта таму хацелася б, каб на працэсы трансфармацыі ўплывалі сапраўдныя спецыялісты. Гады студэнцтва выпрацоўваюць ва ўсіх навыкі, якія будуць запатрабаваны ў далейшым. Але заўсёды патрэбна ўдасканальваць сябе і імкнуцца, каб у кожнага з вас была асабістая калекцыя дыпломаў і атэстацый вас як спецыялістаў экстра-класа", — адзначыў дэкан у сваёй прамове. І, каб не быць галаслоўным, уручыў дыплом акадэміка Міжнароднай акадэміі педагагічных навук загадчыку кафедры глебазнаўства і геалогіі, старшыні Геаграфічнага таварыства Беларусі, прафесару В.С. Аношка.

Потым была прыемная для ўсіх студэнтаў працэдура ўзнагароджання, падчас якой яны пачулі шмат цёплых слоў у свой адрас ад загадчыкаў кафедраў і членаў вучонага савета, атрымалі асалоду ад падрыхтаваных для іх канцэртных нумароў. А напрыканцы вечарыны ўсе запрошаныя сталі сведкамі ўрачыстага адкрыцця бібліятэкі геаграфічнага факультэта і факультэцкага турніру інтэлектуалаў "Што? Дзе? Калі?".

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ, адказны за інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*

А Ў НАС! А Ў ВАС?

# У БДУ працуе Юрыдычная клініка

Прыкладна год таму ў нашым універсітэце з'явілася арганізацыя з незвычайнай назвай — Юрыдычная клініка. Чаму «клініка»? Для чаго прызначаная ўстанова з такой дзіўнай назвай? Як высвілася, сэнс тут глыбокі...

На пачатку XX стагоддзя ў Расійскай імперыі пры медыцынскіх ВНУ ствараліся клінікі — структуры, дзе вялася навуковая і навучальная работа, дзе студэнты-медыкі маглі атрымаць практычныя навыкі працы. Пазней па аналогіі сталі з'яўляцца і юрыдычныя «клінікі» — пры юрыдычных факультэтах некаторых ВНУ Пецярбурга. Там будучыя юрысты маглі на практыцы прымяняць свае тэарэтычныя веды. Так «клініка» перайшла з медыцыны ў юрыспрудэнцыю...

Юрыдычная клініка БДУ была створана пры юрыдычным факультэце ў рамках праекта Праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь. Праект падтрыманы таксама Прадстаўніцтвам Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь.

Галоўная мэта праекта — удасканаленне працэсу навучання студэнтаў юрыдычнага факультэта БДУ, прывіццё ім навыкаў аказання юрыдычных паслуг, афармлення дакументаў, вывучэнне і засваенне нормаў прававой этыкі. «Без пяці хвілінаў» дыпламаваныя спецыялісты аказваюць прававую дапамогу прадстаўнікам малазабяспечаных катэгорый насельніцтва: інвалідам, пенсіянерам, навучэнскай моладзі, бежанцам і асобам, якія шукаюць прытулак, — у пытаннях працоўнага, грамадзянскага, зямельнага, сямейнага, спадчыннага і жыллёвага права. У клініцы тлумачаць дзейнае заканадаўства, дапамагаюць складаць дакументы юрыдычнага характару, кансультуюць наконт парадку дзеянняў пры абароне інтарэсаў грамадзянаў у дзяржаўных органах, а таксама аказваюць іншую інфармацыйна-прававую дапамогу. Нядаўна клініка пачала таксама аказваць юрыдычную дапамогу ў выглядзе пісьмовых кансультацый на пісьмовыя запыты асуджаных, якія адбываюць пакаранне ў выпраўленчых калоніях Беларусі, па сацыяльных пытаннях.

Студэнты вельмі адказна ставяцца да сваёй працы. Зараз у клініцы працуюць 30 студэнтаў, размеркаваныя па трох секцыях у адпаведнасці з профілем дзейнасці. Дапамагаюць ім і кантралююць кансультацыі два адвакаты з Мінскай гарадской калегіі адвакатаў — Аксана Маісеева і Наталля Макарчык, а таксама кансультант-менеджэр Аляксандр Півавараў. Кіруе ўсёй працай дырэктар — дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ, кандыдат юрыдычных навук Анатоль Война.

Часцей за ўсё звяртаюцца для кансультацый па сямейных, жыллёвых, працоўных і спадчынных пытаннях. Студэнты стараюцца дапамагчы ўсім. Так, нядаўна Юрыдычная клініка дамовілася з Беларускай асацыяцыяй інвалідаў-калясачнікаў, што інвалідам будзе аказвацца юрыдычная дапамога па пытаннях, звязаных з парушэннем іх правоў. І хаця клініка пачала дзейнічаць толькі крыху больш за год таму, юрыдычную дапамогу атрымалі ўжо больш за 250 кліентаў, якія змаглі вырашыць свае праблемы дзякуючы дапамозе студэнтаў.

Размяшчаецца Юрыдычная клініка ў інтэрнаце № 4 БДУ (праспект Машэрава, 9, пакоі 109, 111). Для таго каб вырашыць свае праблемы з дапамогай супрацоўнікаў гэтай структуры, трэба патэлефанаваць на нумар 223-69-43 з 12.00 да 20.00 (апрача суботы і нядзелі), сцісла пераказаць сутнасць праблемы і дамовіцца на сустрэчу ў зручны для вас час.

*Людміла САРОКІНА*

ВЕЧАРЫНЫ

# За кубачкам чаю

Вечарына пад назвай «Рускі чай», падрыхтаваная факультэтам дауніверсітэцкай адукацыі паспела ўжо стаць традыцыйнай. Можна проста здзівіцца, як ператвараецца звычайная студэнцкая сталовая № 5 на такую вечарыну: прыгожа сервіраваныя сталы, утульная абстаноўка...

Творчую праграму вечарыны, што прайшла 24 красавіка, рыхтавалі не толькі слухачы факультэта, але і госці: ансамблі народнага танца «Крыжачок» і «Чабарок», танцавальны клуб «Піруэт». Вялі вечарыну Кацярына Камека, Дзмітрый Бачкоў і Го Чынь Чжан, які пасля зазначыў: «Для мяне вечарына «Рускі чай» — першы публічны выступ па-руску. Я вельмі хваляваўся». Спяваў для прысутных свае песні бард Вадзім Кіенка. Слухачы падрыхтоўчага аддзялення паказалі сцэнічныя пастаноўкі. Скончылася вечарына дыскатэкай.

*Сняжана ЛІСОЎСКАЯ,*
*Дзмітрый БАЧКОЎ,*
*слухачы факультэта дауніверсітэцкай адукацыі*

# Паэзія на юрфаку

«Дзень паэзіі», прымеркаваны да юбілеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа, прайшоў на юрыдычным факультэце БДУ. Удзельнікі вечарыны спявалі песні, чыталі вершы вядомых паэтаў і уласныя творы.

Адкрыла вечарыну В.С. Бранавец, якая зачытала віншаванне прысутным ад старшыні Саюза жанчын БДУ сп. Савіной і ад дэкана юрыдычнага факультэта С.А. Балашэнкі.

Біяграфіі беларускіх песняроў нагадала першакурсніца Ганна Жарабцова. Сваімі развагамі пра Янку Купалу падзяліліся літаратуразнаўца і паэтка Ірына Багдановіч і драматург Андрэй Курэйчык, аўтар п'есы пра паэта. Гучалі вершы беларускіх і рускіх паэтаў. Дзве песні на словы Ларысы Геніюш выканаў Аляксей Вярэнчыкаў. Свае творы чыталі Яўген Селівонец, Ксеня Гур'ева, Дзяніс Грачоў, Уляна Быкоўская, Марына Майсеева, Іна Амельчанка і Марыя Ярмок.

Вечарына прайшла ў цёплай сяброўскай атмасферы і закончылася агульнымі спевамі і падарункамі ад Саюза жанчын БДУ.

*Іна АМЕЛЬЧАНКА*

АБ'ЯВЫ

## Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

*аб'яўляе конкурс*
*на замяшчэнне пасад:*

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: германскіх моў, матэматычнага забеспячэння АСК, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, кібернетыкі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: міжнародных адносін, матэматычнага забеспячэння АСК, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, філасофіі культуры, сацыяльнай камунікацыі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння АСК, вышэйшай матэматыкі, вылічальнай матэматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, тэхналогіі праграміравання, германскіх моў, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, ядзернай фізікі, фізіялогіі і біяхіміі раслін, мікрабіялогіі, заалогіі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, тэорыі літаратуры, рускай літаратуры, рускай мовы, фізічнага выхавання і спорту, неарганічнай хіміі, фізічнай хіміі, фізічнай оптыкі, функцыянальнага аналізу, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, тэарэтычнай і прыкладной механікі, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, экалагічнага і аграрнага права, фізікі, фізічнай электронікі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, эканамічных навук, менеджменту, сацыяльнай камунікацыі, біяфізікі, методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі, тэорыі функцыі, дыферэнцыяльных ураўненняў, ураўненняў матэматычнай фізікі, фізічнага выхавання і спорту, беларускай літаратуры XX стагоддзя, беларусазнаўства, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, усходніх моў, міжнародных эканамічных адносін, раманскіх моў, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, тэхналогіі праграміравання, рамана-германскіх моў, нямецкай мовы, сістэмнага аналізу, глебазнаўства і геалогіі, геаграфічнай экалогіі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, псіхалогіі, сацыяльнай камунікацыі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнага землязнаўства, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, менеджменту, нямецкай мовы, рамана-германскіх моў, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, германскіх моў, усходніх моў, мытнай справы, рускай мовы, класічнай філалогіі, фізічнага выхавання і спорту, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, крымінальнага права, канстытуцыйнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, філасофіі і метадалогіі навукі, псіхалогіі, сацыялогіі, сацыяльнай камунікацыі;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інфарматыкі, фізічнай хіміі, арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў, лазернай фізікі, фізікі цвёрдага цела, аналітычнай хіміі, мікрабіялогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, заалогіі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, ядзернай фізікі, матэматычнага забеспячэння АСК, метадаў аптымальнага кіравання, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, матэматычнага мадэліравання і аналізу даных.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Беларускі дзяржаўны універсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

## Навукова-даследчая ўстанова «Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі» Беларускага дзяржаўнага універсітэта

*аб'яўляе конкурс*
*на замяшчэнне вакантных пасад:*

загадчыка лабараторыі метралагічнага забеспячэння эксперыменту — 1 чалавек;
загадчыка лабараторыі люмінесцэнцыі — 1 чалавек;
навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 02.00.04 (фізічная хімія) — 1 чалавек;
навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.05 (оптыка) — 1 чалавек.

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 277-48-43.*

## Установа Беларускага дзяржаўнага універсітэта «Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем»

*аб'яўляе конкурс*
*на замяшчэнне вакантных пасад:*

навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі свабодна-радыкальных працэсаў;
навуковага супрацоўніка лабараторыі ультрадысперсных і нанаструктураваных сістэм.

*Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.*

ПАДПІСКА — 2002

## «Веснік БДУ»

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2002 года. Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях наступная:

Серыя І — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень):
індывідуальная (індэкс 74851) — 2 259 руб.;
ведамасная (індэкс 748512) — 4 937 руб.

Серыя ІІ — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік):
індывідуальная (індэкс 74852) — 2 259 руб.;
ведамасная (індэкс 748522) — 4 937 руб.

Серыя ІІІ — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад):
індывідуальная (індэкс 74853) — 4 518 руб.;
ведамасная (індэкс 748532) — 9 873 руб.

Серыя IV — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань):
індывідуальная (індэкс 74854) — 4 518 руб.;
ведамасная (індэкс 748542) — 9 873 руб.

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

*Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса*

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Гісторыя Волі і Любові

Некалькі месяцаў таму з'явілася кніга, якая не пакіне абыякавым нікога, хто цікавіцца гісторыяй і культурай. Гэта гістарычны раман-дакумент Алеся Пашкевіча «Пляц Волі». Раман напісаны аўтарам па выніках карпатлівых архіўных пошукаў. У ім апісваюцца малавывучаныя старонкі змагання за незалежнасць Беларусі ў першай палове ХХ стагоддзя і па-мастацку даследуюцца жыццяпісы многіх дзеячоў нацыянальнага адраджэння: Францішка Аляхновіча, Радаслава Астроўскага, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Уладзіміра Дубоўкі, Усевалада Ігнатоўскага, Вацлава Ластоўскага, Юркі Лістапада, Янкі Купалы і іншых. У рамане паказанае жыццё беларускай дыяспары ў Літве, Латвіі, Чэхіі, Нямеччыне і Польшчы. Кнігу ўзбагачаюць спасылкі на біяграфічныя і архіўныя крыніцы.

Кніга Алеся Пашкевіча мела вялікі рэзананс у літаратурных колах. Сведчанне гэтага — вечарына-прэзентацыя, якая адбылася па ініцыятыве бібліятэкі БДУ ў чытальнай зале галоўнага корпуса нашага універсітэта. На ёй прысутнічалі многія вядомыя пісьменнікі: Алег Лойка, Кастусь Цвірка, Генрых Далідовіч, Сяргей Кавалёў, Ганад Чарказян і іншыя. Павіншаваць свайго настаўніка, выкладчыка кафедры беларускай літаратуры ХХ стагоддзя прыйшлі і студэнты філалагічнага факультэта.

Прыемна было тое, што ад чытачоў на прэзентацыі выступіў дэкан геаграфічнага факультэта І.І. Пірожнік, адзначыўшы асаблівасць рамана — паказ гісторыі праз геаграфію падзей і біяграфію канкрэтных людзей.

На вечарыне не было сумна нікому, а музычны дуэт чацвертакурснікаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта Анатоля Івашчанкі і Ганны Пазюк надаў сустрэчы своеасаблівы лірызм і непаўторнасць.

*Паводле інфармацыі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ падрыхтавала Вольга ПАНКРАЦЕНКА*

РЫХТУЙСЯ ЗАГАДЗЯ

# Кнігі для абітурыентаў

З пачатку мая ў бібліятэцы факультэта даўніверсітэцкай адукацыі арганізуецца кніжная выстава «У дапамогу абітурыенту», якая будзе дзейнічаць да чэрвеня.

Для выставы падабраная літаратура з асноўнага кнігасховішча Фундаментальнай бібліятэкі БДУ па ўсіх галінах ведаў: матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, геаграфіі, беларускай і рускай мове і літаратуры, гісторыі, псіхалогіі. Усяго — больш за 200 назваў кніг. Хочацца адзначыць некаторыя з іх:

Амелькин В.В., Филипович К.С., Юрчук Н.Н. Экзамен по математике? Нет проблем!: Материалы вступительных экзаменов в БГУ в 1999 г. с решениями и комментариями. — Мн., 2000.

300 конкурсных задач по математике. — М., 1999.

Самусенко А.В., Казаченок В.В. Математика: типичные ошибки абитуриентов. — Мн., 1998.

Парфентьева Н.А., Фомина М.В. Правильные решения задач по физике. — М., 2001.

Супрун-Белевич Л.Р., Чечет Р.Г. Готовимся к экзамену по русскому языку. Тесты-диктанты. — Мн., 2001.

Розенталь Д.Э. Русский язык: Для поступающих в вузы. — М., 1995.

История Беларуси: Учебно-информационное пособие. — Мн., 2001.

Русская литература XIX—XX веков. В 2 т. — М., 2001.

Будай У.Г., Калюта А.М., Лаўрэненка А.В., Шкраба І.Р. Беларуская мова: сціслa і даступна. — Мн., 1997.

Бельскі А. Сучасная літаратура Беларусі: дапаможнік для настаўнікаў [школьнікам, абітурыентам, навучэнцам]. — Мн., 2000.

Льюис М. Химия: Школьный курс в 100 таблицах. — М., 1997.

У дадатак да выставы складзена картатэка кніг, якія ёсць у фондах Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, для тых, хто паступае ў ВНУ. У картатэцы ёсць інфармацыя пра колькасць асобнікаў і месцы размяшчэння кніг па пэўнай тэматыцы.

Бібліятэка факультэта даўніверсітэцкай адукацыі працуе з 9 да 17 гадзін, апроч суботы і нядзелі. Чытальнай залы ў бібліятэцы няма.

*Паводле інфармацыі бібліятэкі факультэта даўніверсітэцкай адукацыі падрыхтавала Вольга ПАНКРАЦЕНКА*

КОНКУРСЫ

# Міс Вясна — 2002

Прыгожых, таленавітых і смелых дзяўчат у нашым універсітэце шмат. Кожны год гэта пацвярджае конкурс прыгажосці "Міс Вясна", які сёлета прайшоў у пяты раз.

Адбывалася свята прыгажосці ў актавай зале філалагічнага факультэта. Аздабленне сцэны стварала атмасферу казкі. І казка атрымалася незабыўная і шчаслівая дзякуючы шасці феям, іх індывідуальнасці і непаўторнасці. Тытулы і званні былі размеркаваныя наступным чынам:

"Міс Шарм" — Наталля Скудная (студэнтка юрыдычнага каледжа, інтэрнат № 1);

"Міс Усмешка" — Алена Волах (студэнтка факультэта філасофіі і сацыяльных навук, інтэрнат № 7);

"Міс Элегантнасць" — Паліна Паснічэнка (студэнтка эканамічнага факультэта, інтэрнат № 4);

"Міс Грацыя" — Марына Бязуглава (студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, інтэрнат № 4);

"Міс Чароўнасць" — Тацяна Мацюк (студэнтка біялагічнага факультэта, інтэрнат № 10);

"Міс Вясна" — Ірына Мальцава (студэнтка хімічнага факультэта, інтэрнат № 3).

У перапынках паміж конкурсамі на сцэне выступалі: студыя сучаснага эстраднага танца "Non Stop", уладальнік Гран-пры фестывалю "Срэбраныя струны" Яўген Селівонец, а таксама Аксана Хуцкая і Тацяна Булака. Асаблівае ўражанне на гледачоў зрабілі калекцыі "Цела і душа" і "Сем дзён" фестывалю моды, прычоскі і фота "Млын моды", прадстаўленыя Цэнтрам сучаснага стылю і моды "Universum models" БДУ пад кіраўніцтвам Сашы Варламава.

Хацелася б выказаць падзяку арганізатарам і заснавальнікам конкурсу "Міс Вясна — 2002": рэктарату БДУ, АТ "Апякунскі савет студэнцкага гарадка БДУ", рэстарану "Шынок у Лявона", стаматалагічнай клініцы "Джанатан", салону-цырульні "Валянціна", упраўленню па выхаваўчай рабоце з моладдзю БДУ, прафсаюзнаму камітэту студэнтаў БДУ, радыястанцыі "Unistar — Радыё БДУ".

*Юлія ЛАЗАР, Кацярына ЛОБАЧ, студэнткі III курса факультэта журналістыкі*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Бібліятэка БДУ запрашае

*У маі пройдуць наступныя кніжныя выставы, арганізаваныя Фундаментальнай бібліятэкай БДУ:*

2 мая на абанеменце бібліятэкі радыёфізічнага і біялагічнага факультэтаў (вул. Курчатава, 5) пройдзе кніжная выстава "Багацце расліннага свету Зямлі";

у чытальнай зале бібліятэкі радыёфізічнага і біялагічнага факультэтаў (вул. Курчатава, 5) адбудзецца кніжная выстава "Бытавая радыёапаратура: настройванне і наладка".

3 мая ў чытальнай зале геаграфічнага факультэта (вул. Ленінградская, 16) будзе экспанавацца кніжная выстава "Узаемадзейнасць клімату з іншымі кампанентамі прыроды".

6 мая ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) пройдзе кніжная выстава да Дня Перамогі "Этот день Победы...";

у бібліятэцы факультэта даўніверсітэцкай адукацыі для беларускіх і замежных грамадзян (вул. Кастрычніцкая, 4) будзе арганізавана кніжная выстава "Вялікая Айчынная: гісторыя і памяць".

7 мая на абанеменце бібліятэкі юрыдычнага факультэта (вул. Маскоўская, 17) адбудзецца кніжная выстава да Дня Перамогі "Доўгія вёрсты вайны".

8 мая ў чытальнай зале бібліятэкі хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) пройдзе кніжная выстава навуковых работ дацэнта кафедры фізічнай хіміі Т.А. Савіцкай, прымеркаваная да 50-годдзя з дня нараджэння;

на абанеменце бібліятэкі хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) пройдзе кніжная выстава, прысвечаная Дню хіміка.

10 мая ў студэнцкай чытальнай зале літаратуры па прыродазнаўчых навуках (прасп. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 3 паверх) будзе экспанавацца кніжная выстава "Системы программирования MS Excel, MS Word, MS Windows".

13 мая ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта журналістыкі (вул. Маскоўская, 15) адбудзецца кніжная выстава, прымеркаваная да 120-годдзя з дня нараджэння Уладзіслава Галубка "Адхінуўшы заслону часу";

13 мая на абанеменце бібліятэкі хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) пройдзе кніжная выстава навуковых прац дацэнта кафедры арганічнай хіміі А.П. Яльніцкага, прысвечаная 65-годдзю з дня нараджэння;

на абанеменце навуковай і мастацкай літаратуры (прасп. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 2 паверх) будзе арганізавана кніжная выстава "Города и земли Германии".

14 мая ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) адбудзецца кніжная выстава "История политических учений";

у чытальнай зале бібліятэкі юрыдычнага факультэта (вул. Маскоўская, 17) пройдзе кніжная выстава "Прававое рэгуляванне знешнеэканамічнай дзейнасці".

20 мая ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта журналістыкі (вул. Маскоўская, 15) адбудзецца кніжная выстава "Лирик в прозе", прымеркаваная да 110-годдзя з дня нараджэння К. Паўстоўскага.

24 мая на абанеменце бібліятэкі філалагічнага, эканамічнага і факультэта філасофіі і сацыяльных навук (вул. К. Маркса, 31) пройдзе кніжная выстава да Дня славянскага пісьменства і культуры;

у бібліятэцы факультэта даўніверсітэцкай адукацыі для беларускіх і замежных грамадзян (вул. Кастрычніцкая, 4) будзе дэманстравацца кніжная выстава "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай ..."

27 мая на абанеменце бібліятэкі факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) адбудзецца кніжная выстава "Дыпламатычная перапіска".

30 мая ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта журналістыкі (вул. Маскоўская, 15) пройдзе кніжная выстава "Великий реформатор России Пётр I";

у чытальнай зале бібліятэкі хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) будуць экспанавацца навуковыя работы дацэнта кафедры арганічнай хіміі А.М. Бубеля. Выстава прымеркаваная да 65-годдзя з дня нараджэння навукоўца.

31 мая ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) пройдзе кніжная выстава, прысвечаная Міжнароднаму дню аховы навакольнага асяроддзя "Прававая ахова навакольнага асяроддзя";

на абанеменце навуковай і мастацкай літаратуры (прасп. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 2 паверх) будзе дэманстравацца выстава навуковых работ прафесара, доктара гістарычных навук, загадчыка кафедры гісторыі новага і навейшага часу У.С. Кошалева, прысвечаная 55-годдзю з дня нараджэння;

у другой палове мая будзе арганізаваны інфармацыйна-аналітычны агляд "Проза маладых беларускіх аўтараў" па публікацыях часопісаў "Маладосць", "Полымя", "Нёман" (месца і час правядзення будуць аб'яўлены дадаткова).

*Аддзел бібліятэчнай рэкламы Фундаментальнай бібліятэкі БДУ*

ЗНАЁМЦЕСЯ

# Тэатральны бенефіс

Тэатр-студыя БДУ «На філфаку» заканчвае свой пяты сезон бенефісам выпускнікоў, сярод якіх ёсць не толькі будучыя філолагі, але і юрысты, і філосафы... Як і ўсе студэнты, яны перажываюць цяжкасці выпускнога курсу: выбар тэмы для дыпломнай работы, падрыхтоўка да выпускнога балю, пытанне размеркавання. Аднак нават у гэты складаны час на прапанову аднакурснікаў схадзіць адпачыць яны адказваюць нязменна: «Сёння не магу — рэпетыцыя...»

А пачалося ўсё пяць гадоў таму, калі ў актавай зале філалагічнага факультэта сабраліся ўсхваляваныя, у нецярплівым жаданні далучыцца да таемстваў тэатра навічкі. Пад кіраўніцтвам дасведчаных рэжысёраў і таленавітых педагогаў Людмілы Іосіфаўны Ярмак і Сяргея Яўгенавіча Глебава за час шматлікіх цяжкіх рэпетыцый яны склалі аснову трупы, яе «ветэранаў».

А выпрабаванняў і сапраўды было багата. І самым цяжкім з іх стала страта рэжысёра Сяргея Глебава, з якім звязаныя лепшыя моманты ў жыцці тэатра: спектаклі, гастролі, цудоўныя чалавечыя повязі. Апошні пастаўлены ім спектакль «Цар Іудзейскі» па п'есе Канстанціна Раманава нядаўна прайшоў на сцэне Мінскай духоўнай семінарыі і акадэміі, а ў хуткім часе плануецца яго пастаноўка на сцэне філфака. Такі ж лёс чакае і веснавую прэм'еру — спектакль па матывах апавядання Сельмы Лагерлёф. А ўвогуле ў рэпертуары тэатра было многа розных пастановак: і гісторыя Дон Жуана на новы лад (п'еса С. Алёшына «Тады ў Севільі»), і працяг трагедыі У. Шэкспіра аб Рамэа і Джульеце ў варыянце Р. Горына «Чума на абодва вашыя дамы», і экспромты на тэмы пушкінскіх паэмаў, і шмат-шмат іншага...

Многія акцёры пасля выпускнога балю і размеркавання раз'едуцца, але павязуць з сабой самыя лепшыя ўспаміны пра студэнцкае жыццё. А тэатр-студыя «На філфаку» працягне жыць і радаваць свайго гледача, які то глядзіць строга, то шчыра суперажывае, бо да сапраўднага мастацтва нельга заставацца абыякавым.

*Настасся ШКОЛА*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
25 красавіка 2002 года, чацвер, № 9 (1857)

ПАСМІХНЕМСЯ!

***

Прафесар увайшоў і пачаў манатонна чытаць напісаны тэкст. У зале паступова ўсталявалася цішыня. Раптам яе перарваў вокліч з задняй парты:

— Гучней!

Лектар спыніўся, зняў акуляры, паглядзеў на заднія шэрагі і спытаў:

— А яно вам трэба?

***

Кватэра фізіка — усё завалена прыборамі і прыладамі. Фізік кажа жонцы:

— Каханая, выйдзі на вуліцу і пазвані мне з таксафона, а то я не магу знайсці наш тэлефон.

***

Навуковец чытае лекцыю ў жаночым клубе. Пасля лекцыі вакол яго сабраліся жанчыны і закідалі пытаннямі.

— Прафесар, — пытаецца адна з іх, — вы казалі пра дэтэктары хлусні. А вам самому даводзілася іх бачыць?

— Бачыць? — уздыхнуў прафесар. — Я ажаніўся з такім дэтэктарам.

***

Прафесар чытае лекцыю некалькі гадзінаў запар.

— Даруйце, што я так падрабязна, — кажа ён, — але ў мяне няма гадзінніка.

Голас з аўдыторыі:

— У вас за спінай вісіць каляндар.

## Правілы выжывання ў хімічнай лабараторыі:

калі вы раскрылі што-небудзь — закрыйце;

калі ў вас у руках што-небудзь вадкае — не разліце, парашкападобнае — не рассыпце, газападобнае — не выпусціце вонкі;

калі ўключылі — выключыце;

калі разабралі — збярыце;

калі не можаце сабраць — паклічце на дапамогу майстра;

калі пазычылі што-небудзь — вярніце;

калі карыстаецеся чым-небудзь — трымайце ў чысціні і парадку;

калі навялі дзе-небудзь беспарадак — аднавіце статус-кво;

калі вы ссунулі што-небудзь — вярніце на месца;

калі хочаце скарыстацца чым-небудзь, што належыць не вам, — папрасіце дазволу;

калі вы не ведаеце, як гэта дзейнічае, — калі ласка, не чапайце;

калі вас гэта не датычыць — не лезьце;

калі не ведаеце, як гэта робіцца, — спытайце;

калі не можаце што-небудзь зразумець — пачухайце патыліцу;

калі нічога не разумееце — і не спрабуйце;

калі вы не гарыце на працы — пастарайцеся, каб у вас нічога не загарэлася;

калі ў вас што-небудзь узарвалося — праверце, ці засталіся вы ў жывых;

калі вы не засвоілі гэтыя правілы — не ўваходзьце ў лабараторыю.

***

Вядомы аўстрыйскі хімік Адольф Франк падчас іспыту сказаў студэнту:

— Вы вельмі вынаходлівы і кемлівы. Галоўнае, што вы ўмееце ў невялікай колькасці словаў выказаць вельмі багата глупства...

НАДОЕЧЫ

# А жанчынам — «Здароўе»!

Клуб «Здароўе» існуе пры Савеце жанчын БДУ. Узначальвае клуб дацэнт Аляўціна Паўлава.

Кожны тыдзень збіраюцца ў аўдыторыі хімфака супрацоўніцы універсітэта. За кубачкам гарбаты яны дзеляцца сваімі «сакрэтамі» — як лепей захаваць здароўе і прыгажосць. Часта на гэтыя вечарыны запрашаюць медыкаў. На апошнім пасяджэнні клуба «Здароўе» эндакрынолаг Ірына Бранавец распавяла пра гарманальны статус і яго ролю ў здароўі жанчыны. Наступным госцем клуба стане спецыяліст бальніцы хуткай дапамогі кардыёлаг Таццяна Максімчук.

*Ганна АНДРУШЭВІЧ*



ВЫСТАВЫ

# Каменная казка — 2002

Напрыканцы сакавіка ў галоўным корпусе БДУ праходзіла XVI выстава-кірмаш "Каменная казка", прымеркаваная да Дня геолага. Падчас яе наведнікі змаглі акунуцца ў сапраўдную казачную вясёлку колераў, пабачыць шматлікія формы, якія прымае камень і іншыя прыродныя матэрыялы пад рукой таленавітага майстра, а таксама набыць тыя з вырабаў, якія найбольш прыйшліся даспадобы. На выставе дэманстраваліся калекцыі мінералаў і горных парод Кольскага паўвострава, Урала, Украіны і нават Паўднёвай Амерыкі. Працавала на выставе і экспрэс-лабараторыя, дзе з дапамогай мікраскопа кожны з наведнікаў мог убачыць дробную структуру, здавалася б, маналітнай горнай пароды. Акрамя гэтага, супрацоўнікі музея землязнаўства і студэнты геафака праводзілі шматлікія экскурсіі для школьнікаў як па выставе, так і па музеі.

Падчас выставы на геафаку чыталі навукова-папулярныя лекцыі вядучыя геолагі Беларусі. Так, сёлета ўсіх жадаючых на свае адкрытыя лекцыі запрашаў адзін з найбуйнейшых спецыялістаў па беларускім бурштыне, прафесар Брэсцкага педагагічнага універсітэта А.А. Багдасараў. А прывезеная ім археалагічная калекцыя вырабаў з беларускага бурштыну, сабраная падчас раскопак і датаваная IX-XIII стагоддзямі, выклікала цікавасць не толькі ў геолагаў, але і ў гісторыкаў.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт геафака БДУ*

НАША ЗДАРОЎЕ

# Галоўнае — здаровы лад жыцця

Пра здароўе мы найчасцей узгадваем тады, калі пачынаем яго губляць. Але зберагчы сваё здароўе можа пастарацца кожны, і гэта ў нашых сілах.

Сучасныя ўмовы жыцця ставяць павышаныя патрабаванні да здароўя і інтэлектуальных здольнасцяў маладых людзей. На арганізм студэнтаў найбольш неспрыяльна ўплываюць наступныя фактары: высокі ўзровень псіхаэмацыйнай нагрузкі, незбалансаванасць і недастатковасць харчавання, шкодныя звычкі (асабліва курэнне), нясвоечасовы зварот па медыцынскую дапамогу, абыякавае стаўленне да свайго здароўя. Вынікі медаглядаў сведчаць, што абсалютна здаровымі з'яўляюцца толькі 4-5 % усіх студэнтаў. Атрымліваецца, што маладосць і здароўе — паняцці не тоесныя.

Кожны чалавек павінен ведаць, што яго здароўе на 60-65 % залежыць ад таго ладу жыцця, які ён вядзе. Для таго каб захаваць здароўе, найперш трэба весці правільны лад жыцця. Сюды можна залічыць правільны расклад дня, з абавязковай ранішняй гімнастыкай і далейшымі воднымі працэдурамі (душ, абліванне ці абціранне вільготным ручніком). Гэта спрыяе загартоўванню арганізма і павышае супраціўляльнасць прастудным захворванням, папярэджвае захворванні пазваночніка, умацоўвае нервовую сістэму. Пастаяннае нервова-псіхічнае напружанне, якое адчуваюць студэнты, без рэгулярнай фізічнай разгрузкі выклікае цяжкія функцыянальныя разлады ў арганізме, зніжае працаздольнасць.

Для студэнтаў вельмі важным з'яўляецца 4-разовае харчаванне (а не двухразовае, як найчасцей бывае). А ўзімку і ўвесну неабходна дапаўняць запас вітамінаў 1-2 дражэ полівітамінаў штодзень. У рацыён харчавання мусяць у дастатковай колькасці ўваходзіць садавіна і гародніна, кісламалочныя прадукты. З жывёльных прадуктаў менш за ўсё радыенуклідаў у мясе курэй, індычкі, труса. Няблага таксама ўключаць у рацыён прадукты з соі, марскую капусту ды іншыя морапрадукты.

Зберагчы здароўе дапамагае і асабістая гігіена (у прыватнасці, вельмі важна чысціць зубы пасля сняданку і вячэры).

Для папярэджання блізарукасці неабходна захоўваць зрокавы рэжым: праз кожныя 30-40 хвілінаў бесперапыннага чытання ці працы за камп'ютарам трэба даваць вачам адпачываць (паглядзець удалячынь ці, расслабіўшыся, пасядзець з закрытымі вачамі некалькі хвілінаў).

Здаровы лад жыцця несумяшчальны са шкоднымі звычкамі: курэнне тытуню, спажыванне алкаголю і іншых ап'яняльных наркатычных сродкаў уваходзяць у лік найважнейшых фактараў рызыкі развіцця многіх захворванняў і істотна ўплываюць на стан здароўя чалавека. Апрача таго, гэтыя рэчывы прыводзяць да катастрафічна хуткага прызвычаення да іх маладых людзей (з-за асаблівасцяў іх цэнтральнай нервовай сістэмы).

Для зберагання свайго здароўя неабходна вучыцца кіраваць сваімі эмоцыямі, як мага спакайней ставіцца да розных непрыемнасцяў і часцей пасміхацца.

*А.А. ФАМІНА,*
*загадчыца аддзялення*
*33-й студэнцкай паліклінікі*

АКТУАЛЬНА

# Новы праект ЮНЕСКА і Discovery Channel

У красавіку ЮНЕСКА абвясціла пра пачатак новага сумеснага праекта з вядомым тэлеканалам Discovery Channel, мэтай якога стане інфармаванне грамадскасці наконт праблемы аховы культурнай спадчыны і моваў, якія знаходзяцца на мяжы знікнення.

Паводле статыстыкі, у свеце існуе 3000 моваў, носьбітаў кожнай з якіх менш за 10.000 чалавек. З гэтых 3000 моваў можна вылучыць 750, на кожнай з якіх размаўляе менш за 1000 чалавек. Лічыцца, што мова знаходзіцца на мяжы знікнення, калі на ёй размаўляе менш за 30 % дзяцей.

«Кожная мова унікальная, і кожная мова — частка жывой культурнай спадчыны, якую мы павінны зберагаць», — заявіў Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Каіхіра Мацуура.

Ключавымі момантамі тэлепраграмаў, якія, як мяркуецца, будуць трансляваццa ў 154 краінах свету, стануць сюжэты, якія будуць знаёміць гледачоў з малавядомымі і вымiраючымі мовамі і культурамі тых краінаў, у якіх насельніцтва размаўляе на гэтых мовах.

«Для Discovery Channel вельмі важна арганізоўваць з вядучымі міжнароднымі арганізацыямі праекты, якія адлюстроўваюць місію нашай кампаніі як сродку масавай інфармацыі, — адзначыў кіраўнік Discovery Channel Дон Макол. — Гэта наш абавязак — інфармаваць грамадскасць пра надзённыя праблемы, якія хвалююць чалавецтва».

*Паводле інфармацыі*
*Прадстаўніцтва ААН у Беларусі*

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# Выбары ў студсаветы

Увесну ў студгарадку прайшлі справаздачна-выбарныя канферэнцыі і выбары ў студсаветы. Дзейнасць усіх студсаветаў за мінулы год была прызнаная здавальняючай. Пасля вылучэння кандыдатураў і галасавання вызначыліся і новыя саставы студэнцкіх саветаў васьмі інтэрнатаў БДУ.

Старшынямі студсаветаў сталі: Уладзіслаў Рэвут (інтэрнат № 1), Кацярына Навіцкая (інтэрнат № 3), Міхаіл Асадчы (інтэрнат № 4), Кацярына Клімовіч (інтэрнат № 6), Юрый Плескацэвіч (інтэрнат № 7), Марына Палазок (інтэрнат № 9), Ігар Багасай (інтэрнат № 10).

Самыя актыўныя члены студсаветаў былі ўзнагароджаныя граматамі і грашовымі прэміямі. Старшыня Каардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў інтэрнатаў Андрэй Панамароў і старшыня Савета па прафілактыцы парушэнняў Правілаў унутранага парадку ў інтэрнатах БДУ Дзмітрый Зімніцкі былі адзначаныя Ганаровымі граматамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

На канферэнцыях таксама абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з будучым засяленнем.

*Інфармацыйная служба*
*студгарадка БДУ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай
Вярхоўнага Савета БССР

*25 красавіка 2002 года*

*Падпісана да друку 24.04.2002*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 656. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Камп'ютэрная вёрстка Андрэя Мікулевіча*
*Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

Рэдактар Т.М. КАЗАК

*Адрас рэдакцыі:*
*220050, Мінск,*
*Універсітэцкі гарадок,*
*вул. Бабруйская, 7,*
*паверх 4, пакой 411,*
*тэлефон 209-53-45.*